## 25 снежня – 110 гадоў з пачатку дзейнасці (1900) дзяржаўнай установы "Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна"

Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна – адна са старэйшых бібліятэк Беларусі. Яна была заснавана ў 1899 г. у гонар 100-годдзя з дня нараджэння А. С. Пушкіна. Гэта першая гарадская публічная бібліятэка ў Мінску, афіцыйнае адкрыццё якой для шырокага кола чытачоў адбылося 25 снежня 1900 г. Знаходзілася бібліятэка на Захар'еўскай вуліцы (цяпер праспект Незалежнасці), узначальваў яе савет, прызначаны гарадской думай, першым кіраўніком якога быў дырэктар рэальнага вучылішча І. І. Самойла. У тыпалітаграфіі Тасьмана і Свей быў надрукаваны Статут Мінскай гарадской публічнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. У ім змяшчаліся 32 пункты, якія вызначалі не толькі задачы бібліятэкі, але і правы і абавязкі чытачоў. На той час большасць з іх складалі навучэнцы, значную частку прадстаўлялі ўрачы, інжынеры і служачыя. У час рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. бібліятэка стала адным з палітычных цэнтраў горада, месцам сустрэч рэвалюцыянераў. У 1909 г. ганаровым членам бібліятэкі быў абраны Л. М. Талстой. У 1938 г. бібліятэка атрымала статус Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. У гады Вялікай Айчыннай вайны яе фонд (каля 170 тыс. экз.) быў знішчаны і разрабаваны, а памяшканне разбурана. З 1944 г. пачалося адраджэнне бібліятэкі. У лістападзе 1971 г. яна атрымала новае памяшканне на вуліцы Гікалы, 4, што дазволіла стварыць самыя спрыяльныя ўмовы для размяшчэння фондаў і работы з чытачамі.

Сёння бібліятэка з'яўляецца не толькі буйнейшым у вобласці кнігасховішчам, але і інфармацыйным, адукацыйным, сацыяльна-культурным цэнтрам. Універсальным фондам, аб'ём якога складае звыш 760 тыс. экз. дакументаў на традыцыйных і электронных носьбітах, у тым ліку 838 назваў перыядычных выданняў, карыстаюцца штогод каля 40 тыс. наведвальнікаў. Сярод рэдкіх выданняў – камплекты часопісаў XIX – пачатку XX ст. "Исторический вестник", "Русская мысль", "Современник" і інш. Да паслуг карыстальнікаў – індывідуальны абанемент, 7 галіновых і спецыялізаваных чытальных зал, дзіцячы філіял імя Я. Маўра. Актыўны працэс інфарматызацыі грамадства паспрыяў мадэрнізацыі абласной бібліятэкі, укараненню новых інфармацыйных тэхналогій, што павысіла якасць абслугоўвання наведвальнікаў. З 1996 г. дзейнічае электронны каталог. У 2003 г. у Інтэрнэце размешчаны web-сайт бібліятэкі, попытам карыстаюцца 3 мультымедыйныя цэнтры. Ствараюцца базы даных "Пушкініяна", "Памяць Міншчыны", "Дзяцінства" і інш. Бібліятэка прадастаўляе сваім карыстальнікам праз віртуальную чытальную залу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі доступ да сусветных інфармацыйных рэсурсаў. З 2007 г. установа здзяйсняе аналітычны роспіс перыядычных выданняў, уваходзячы ў рэспубліканскі бібліятэчны кансорцыум LIBKARD. Публічны цэнтр прававой інфармацыі бібліятэкі стварае аптымальныя ўмовы карыстальнікам для атрымання прававой інфармацыі. У каардынацыі з Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, Саюзам пісьменнікаў Беларусі і іншымі грамадскімі арганізацыямі ўстанова праводзіць шматлікія цікавыя культуралагічныя акцыі. Шмат мерапрыемстваў адбылося ў межах клуба "Кніга і мы", які працуе пры бібліятэцы з 1996 г. Да 200-годдзя з дня нараджэння А. С. Пушкіна пры ўстанове створаны Пушкінскі інфармацыйны асветніцкі цэнтр, у якім сабраны матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю паэта. Выдадзены зводны каталог "Дарэвалюцыйныя выданні А. С. Пушкіна і літаратура пра яго з фондаў бібліятэк, музеяў і архіваў Беларусі", сумесна з Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Ф. Скарыны – зборнік "Пушкін і Беларусь". За шматлікія мерапрыемствы па прапагандзе творчай спадчыны вялікага паэта бібліятэка была адзначана юбілейным медалём і падарункамі ад Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь. У выніку супрацоўніцтва з культурнымі цэнтрамі замежных краін у Беларусі пры ўстанове працуе франка-беларуская зала інфармацыі. Карыстальнікі маюць магчымасць атрымаць разнастайную інфармацыю аб сучаснай Францыі. Традыцыйна праводзяцца такія цікавыя акцыі, як "Дні франкафоніі" і "Свята чытання". Бібліятэчныя праекты міжнароднага супрацоўніцтва значна ўзбагацілі інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі, стварыўшы такім чынам для карыстальнікаў своеасаблівае акно ў сусветную культурную прастору. За значны ўклад у развіццё міжнародных культурных сувязей

дырэктару бібліятэкі Н. С. Чуевай у 2001 г. была прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне".

Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна як навукова-метадычны цэнтр забяспечвае дзейнасць 788 публічных бібліятэк вобласці. Менавіта тут выпрацоўваецца бібліятэчная палітыка рэгіёна, нараджаюцца новыя ідэі і распрацоўваюцца тэхналогіі іх рэалізацыі. Гэта – наладжаная дыферэнцыраваная сістэма павышэння кваліфікацыі спецыялістаў вобласці; арганізацыя міжнародных семінараў; правядзенне ў 2004 г. I з'езда сельскіх бібліятэкараў Міншчыны "Сельская бібліятэка: арыенціры і прыярытэты развіцця"; арганізацыя абласных конкурсаў "Пошук. Арыгінальнасць. Майстэрства", "Прафесіяналізм і наватарста – шлях да поспеху", "Бібліятэчны інтэр'ер", "Жывы свет лялек" і іншых; злётаў маладых паэтаў Міншчыны "Слова Купалы да творчасці кліча"; дзіцячых аглядаў-конкурсаў "Юныя таленты Міншчыны"; разнастайных мэтавых праграм: "Памяць Міншчыны", "Міласэрнасць", "Дзеці. Сям'я. Кніга"; фестывалю бібліятэчнай творчасці "Сэрцам да подзвігу дакраніся", прысвечанага 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і інш.

На павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў у значнай ступені арыентавана выдавецкая дзейнасць абласной бібліятэкі. Штогод выпускаюцца 15–18 назваў бібліяграфічных і метадычных дапаможнікаў: штоквартальны інфармацыйны зборнік "Бібліятэчны веснік", аналітычны матэрыял "Бібліятэкі Міншчыны за... год", бібліяграфічны паказальнік "Літаратура аб Мінскай вобласці", бібліяграфічныя спісы "Па старонках перыядычных выданняў", "У дапамогу эстэтычнаму выхаванню", рэкамендацыйныя спісы да юбілейных дат і г. д.

Мінскай абласной бібліяткай імя А. С. Пушкіна пройдзены вялікі шлях станаўлення і развіцця. Калектыў установы ўпэўнена і з аптымізмам глядзіць у будучыню, здзяйсняючы сваю высакародную місію па ўзбагачэнні інтэлектуальнага патэнцыялу краіны.

**Мінская абласная бібліятэка А. С. Пушкіна** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 2000. Т. 10. С. 418–419.

**Минская областная библиотека имени А. С. Пушкина** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. Минск, 2007. Т. 5. С. 34.

**Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1999. Т. 5. С. 170–171.

**Шыбека, З. В.** Гарадская публічная бібліятэка імя А. С. Пушкіна / З. В. Шыбека // Памяць. Мінск : у 4 кн. / [уклад.: В. С. Семенякоў, А. А. Ляўшэвіч ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў і інш. ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў]. Мінск, 2002. Кн. 2. С. 182–184.

**Чуева, Н. С.** Слова Купалы да творчасці кліча / Наталля Чуева ; запісала Р. Баравікова // Маладосць. 2007. № 6. С. 110–112.

**Чуева, Н. С.** Ищите книгу… / Наталья Чуева // Мінская праўда. 2007. 15 верас. С. 4.

**Чуева, Н. С.** Дружим томами / Наталья Чуева ; беседовала Екатерина Дубинская // Советская Белоруссия. 2006. 1 апр. С. 5.

**Клюева, Е.** Почитаем и читаем / Елена Клюева // Мінская праўда. 2007. 15 лют.

**Жаўняровіч, Л.** Крок да наватарства / Любоў Жаўняровіч // Мінская праўда. 2005. 24 снеж. С. 14.

**Михальчук, Л.** Музыкальное достояние Америки / Лариса Михальчук // Белорусы и рынок. 2009. 21 сент. (№ 37). С. 30.

**Туровіч, А.** Франка-беларускае "Свята чытання – 2005" / Алесь Туровіч // ЛіМ. 2005. 18 лістап. (№ 46). С. 7.

Гл. таксама «Дзяржаўная ўстанова "Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна"». – Рэжым доступу: http://pyshlib.iatp.by.

*Матэрыялы да дат падрыхтавалі бібліятэкі-юбіляры*

*Рэдактар К. Дз. Варанько*